Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (151), 2025

УДК 811.161.3’373.232(476.2-37Акцябрскі) EDN: JRVXRC

# Прозвішчы Акцябрскага раёна адапелятыўнага паходжання

У.А. Бобрык

У артыкуле аналізуюцца групы прозвішчаў жыхароў Акцябрскага раёна. Вылучаны чатыры лексіка-семантычныя групы, што сталі асновай для ўтварэння прозвішчаў. У выніку аўтар даследавання прыйшоў да высновы, што найбольш ужывальнымі з’яўляюцца прозвішчы, суадносныя з назвамі прафесій, родам заняткаў, фізічнымі і фізіялагічнымі характарыстыкамі чалавека.
**Ключавыя словы:** прозвішча, семантыка, адапелятыўнае прозвішча, адтапанімічнае поле, лексіка-семантычная група.

The semantic analysis of the surnames of the Oktyabrsky region citizens is given. Four lexico-semantic groups as the basis for surname formation were singled out. As a result the researcher has come to the conclusion that the most common surnames are the ones that originated from professions, occupations, physical and physiological characteristics of a person.
**Keywords:** surname, semantics, appellative surname, toponymic field, lexico-semantic group.

Аналіз семантыкі і структуры прозвішчаў – цікавая, каштоўная і цяжкая справа, што прызнаецца многімі антрапаністамі. Ён, на думку А. Суперанскай, «дае значную інфармацыю, якая ўяўляе цікавасць для гісторыкаў, этнографаў, сацыёлагаў, а таксама лінгвістаў. Пры параўнанні лексічных палёў, па якіх размяркоўваюцца асновы прозвішчаў у розных мовах, можна зрабіць вывады пра агульнасць або, наадварот, рознасць нацыянальных культур асобных народаў» [1, с. 81].

Лексічны склад беларускіх прозвішчаў надзвычай багаты і разнастайны. Паходжанне многіх беларускіх прозвішчаў матывуванае. Даследчыкі адзначаюць, што шматлікія беларускія прозвішчы ўтварыліся семантычным шляхам – шляхам пераасэнсавання былых назваў-характарыстык асобы па тых ці іншых адзнаках ці ад гутарковых формаў імён. Пазней унутраная форма, матывіроўка (лексічнае значэнне) сцерліся і найменне пачало выконваць чыста намінатыўную функцыю – функцыю вылучэння чалавека сярод іншых.

Прозвішчаў адапелятыўнага паходжання ў беларускай мове даволі многа. Гэта група складае прыкладна каля паловы ўсіх прозвішчаў. Вядомы антрапаніміст М.В. Бірыла адзначае, што «з пункту погляду гісторыі мовы адапелятыўная антрапанімія з’яўляецца захавальнікам, кансервантам лексікі папярэдніх эпох, дае матэрыял для больш глыбокага вывучэння гістарычнага слоўніка, моўных узаемасувязей» [2, с. 4]. Згодна з гэтым у якасці асноў для ўтварэння прозвішчаў магла выкарыстоўвацца лексіка, якая адлюстроўвае самыя разнастайныя галіны жыццядзейнасці народа і акаляючай яго рэчаіснасці – быт, заняткі, становішча ў сям’і і грамадстве, фізічныя, разумовыя і маральныя якасці, пачуцці, сацыяльны ўклад, жывёльны і раслінны свет і пад. У гэтым сэнсе антрапонімы, утвораная ад апелятыўнай лексікі, з’яўляюцца кладоўкай гісторыка-культурнай спадчыны, даюць каштоўны матэрыял для вывучэння агульнай гісторыі народа. Пры ўтварэнні прозвішчаў Акцябрскага раёна выкарыстоўвалася лексіка наступных семантычных груп:

**Прозвішчы, якія абазначаюць фізічныя і фізіялагічныя характарыстыкі чалавека, рысы характару, уласцівасці розуму:** *Бабак* < рэг ‘дурань, безгаловы чалавек’ [2, с. 28]; *Баглай* < ‘непаваротлівы мужчына, лежабок’, рус. ‘гультай, дармаед’ [2, с. 34]; *Байдун* < байда ‘бесклапотны чалавек, марнатраўца’, ‘няскладны, непаваротлівы чалавек, слуп’ [2, с. 34]; *Байбус* < рэг. ‘высакарослы няскладны чалавек’ [2, с. 33]; *Батура* < батура ‘балагур, пустамеля’, рус. ‘упарты, непаслухмяны’ [2, с. 45]; *Біндзюковіч* < біндзюк ‘гультаяваты хлопец, балаўнік’ [2, с. 54]; *Болбас* < рэг. ‘балбатун’ [2, с. 57]; *Бруёк* < бруй ‘той, хто мочыцца ў час сну’ [2, с. 60]; *Бурлачэнка* < ад бурлак [2, с. 70]; *Гайшун* < літ. *gaisus* ‘капун, маруда’ [2, с. 96]; *Галай* < укр. *галай* ‘крыкун’ [2, с. 97]; *Галавач, Галавачэнка* < ‘галаваты’ [2, с. 96];

*Гарбацэвіч, Гарбачэнка* < 'гарбаты' [2, с. 102]; *Гарэльчык* < ад гарэлы [2, с. 105]; *Глушко* < ад глухі [2, с. 111]; *Говар* < 'гаварун, які любіць гаварыць' [2, с. 112]; *Голік* < ад голы [2, с. 113]; *Губанаў* < рэг. 'губач, губаты' [2, с. 119]; *Дзікун* < разм. 'нелюдзімы, дзікаваты чалавек' [3, с. 174]; *Дыгун* < рэг. 'даўганогі' [2, с. 141]; *Жук, Жукавец, Жукаў, Жукоўскі* < перан. 'пра хітрага пранырлівага чалавека' [3, с. 259]; *Жыгун* < рэг. 'хто любіць падглядаць', 'жвавы, спрытны, борзды', 'нагаворшчык, паклёпнік' [2, с. 150]; *Зубар, Зубрыцкі* < зубар 'зубаты' [2, с. 161]; *Кажан, Кажанаў* < кажан 'нізкага росту слабасільны чалавек' [2, с. 167]; *Караткевіч* < ад кароткі [2, с. 187]; *Касалапаў* < 'які пры хадзьбе ставіць ступню наскамі ўсярэдзіну' [4, с. 656]; *Корзун* < рус. *корзун* 'без пярэдніх зубоў, шчарбаты' [2, с. 214]; *Коўзун* < рэг. 'дзіця, якое лазіць, коўзаецца на каленях' [2, с. 193]; *Крук, Крукоўскі* < крук 'скупец, скупы чалавек' [2, с. 219]; *Кульпа* < рус. *кульпа* 'бязрукі ці з пакалечанай рукою', 'пакалечаная рука кукса' [2, с. 230]; *Курылаў* < рус. *курила, курилка* 'п'яніца, гуляка' [2, с. 235]; *Ламака* < 'цяльпух, гультай', рус. *ломака* 'задавака', 'дубінка'; укр. 'здаравец, дубіна' [2, с. 243]; *Лепетуха* < рэг. 'балбатуха, лапатуха' [2, с. 251]; *Лысяк* < рэг. жарт. 'лысы чалавек' [2, с. 260]; *Манько* < манько рэг. 'ілгун, абманшчык; той, хто маніць' [2, с. 275]; *Мігун* < 'маргун, той, хто часта моргае' [2, с. 284]; *Некрашэвіч* < рус. *некраса* 'непрыгожы чалавек ці жывёла' [2, с. 298]; *Нямцоў* < 'нямы' [2, с. 302]; *Прыходзька* < 'той, хто прыйшоў, прышлы' [2, с. 336]; *Пузан, Пузына* < ад пузаты [2, с. 337]; *Прыдыбайла* < ад *прыдыбаць* 'прыйсці, прыхрамаць' [2, с. 334]; *Пупель* < рус. *пупель* 'нізкарослы чалавек' [2, с. 338]; *Пырх* < ад *пархаць* 'той, хто пырхае, непаседлівы чалавек' [2, с. 241]; *Рабцэвіч* < рабко 'рабы' [2, с. 344]; *Рудзінскі, Рудзько, Рудзянкоў, Рудзянок, Руды, Рудэнка* < ад руды [2, с. 354]; *Рыжкоў* < ад рыжы [2, с. 356]; *Сівак, Сівакоў* < 'чалавек з сівымі валасамі' [2, с. 372]; *Сляпнёў* < рэг. 'сляпы чалавек, сляпак' [2, с. 383]; *Сляпцоў* < рэг. 'сляпы чалавек, сляпак' [2, с. 383]; *Сухан, Сухі, Сушкевіч, Сушкоў* < 'сухі, хударлявы чалавек' [2, с. 400]; *Сягай* < рэг. *сягаць* 'ісці шырокім шагам, шырока ступаць' [2, с. 403]; *Сяўрук* < рус. *севрюк* 'пануры, хмуры чалавек, буркун' [2, с. 405]; *Трухан, Труханoвіч* < бел. трухаць 'жвавы, быстры, рухавы чалавек' [2, с. 415]; *Тукай, Тукайла, Тукала* < рэг. *тукала* 'надаедлівы, сварлівы чалавек', 'глухі', 'непаслухмяны, якога трэба падганяць да працы' [2, с. 416]; *Тукач* < рэг. аб дзіцяці 'таўстун' [2, с. 416]; *Тупіцын* < ад тупіца [2, с. 417]; *Філон, Філонаў* < жарг. 'гультай' [2, с. 423]; *Фільчанка* < рус. 'прастак, разява, недалёкі чалавек' [2, с. 424]; *Хаменка* < ад хам [2, с. 426]; *Ходзька* < хода 'той, хто ходзіць' [2, с. 432]; *Храпко* < 'храпун' [2, с. 434]; *Ціхановіч* < 'ціхі, ціхоня' [2, с. 438]; *Цішкевіч* < укр. *тишко* 'ціхоня' [2, с. 439]; *Чарнейка, Чарненка, Чарноцкі, Чарноў* < ад чорны [2, с. 450]; *Чарнушэвіч* < магчыма, 'чорны, чарнявы' [2, с. 448]; *Чумак, Чумакоў* < 'чумак', рэг. 'дуракаваты, недацёпа, чумавы' [2, с. 452]; *Шабалін* < рус. *шабала* 'балбатун, ілгун, бадзяга', 'пустая галава' [2, с. 458]; *Шапель* < рэг. *шапель* 'шапялявы чалавек' [2, с. 465]; *Шаплыка* < ад рэг. *шаплявы* 'шапялявы' [2, с. 467]; *Шаўкун* < рэг. 'той, хто шамкае, невыразна гаворыць з-за адсутнасці зубоў' [2, с. 471]; *Шульга* < рус. 'левая рука', 'ляўша' [2, с. 482]; *Шчур, Шчура* < рус. *щура* 'той, хто шчурыцца', 'хітрун, хітры чалавек' [2, с. 488]; *Шчэрбач* < 'шчарбаты чалавек' [2, с. 487]; *Юркавец, Юркевіч, Юрчанка* < юрко 'юркі, жвавы чалавек' [2, с. 497].

**Назвы асоб па прафесіі ці занятку, сацыяльным становішчы.** Прозвішчы, утвораныя ад назваў прафесій, сведчаць пра разнастайнасць прафесій у Беларусі. З развіццём грамадства зніклі некаторыя прафесіі, а разам з імі страціліся і іх назвы, якія ляжаць у аснове прозвішчаў. Тым не менш іх этымалогія ў большасці застаецца празрыстай. Прозвішчы, што былі ўтвораны ад назваў прафесій, роду заняткаў або выконваемага дзеяння прадстаўляюць сабой каштоўную крыніцу па гісторыі мовы і культуры. *Алейнікаў* < алейнік 'той, які робіць алей' [2 с. 20]; *Асадчы* < укр. *осадчий* 'асаднік, першапасяленец, заснавальнік паселішча' [2, с. 24]; *Бандарчук, Бандарэнка* < 'майстар па вырабу драўлянай пасуды' [4, с. 395]; *Берднік* < рэг. 'брадзячы гандляр бёрдамі', 'майстар, які вырабляе бёрды' [2, с. 52]; *Буднік* < 'рудакоп', укр. *будник* 'работнік на паташным заводзе' [2, с. 64]; *Вайтовіч, Вайценка, Вайценкоў, Вайцэховіч, Вайцяховіч* < войт 'старшыня мяшчанскага ці магдэбургскага суда', 'начальнік гміны', 'наглядчык за прыгоннымі, прыганяты, прызначаны з сялян памешчыкам' [2, с. 89]; *Ганчар, Ганчароў* < бел. 'той, хто вырабляе гліняную пасуду', устар. 'пячнік', 'чарапічнік' [2, с. 101];

*Гарбар* < 'той, хто займаецца апрацоўкай і вырабам шкур' [4, с. 29]; *Гусараў* < гусар 'ваенны з часцей лёгкай кавалерыі' [3, с. 99]; *Дзегцяроў* < дзягцяр 'той, хто гоніць дзёгаць' [4, с. 178]; *Дубовік* < рэг. 'рулявы на лодцы плытагонаў, якая называецца 'дуб', рус. *дубовик* 'лодачнік, перавозчык' [2, с. 139]; *Кавалевіч, Каваленка, Кавалёў, Кавалеўскі, Кавальчук, Коваль* < каваль 'рабочы, майстар, які займаецца коўкай металу' [4, с. 570]; *Казак, Казакоў, Казакоўскі, Казачкоў, Казачонак, Казачэнка* < казак 'вольны чалавек з прыгонных сялян, халопаў, гарадской беднаты', 'прадстаўнік ваеннага саслоўя', 'радавы асобых (звычайна кавалерыйскіх) вайсковых часцей' [4, с. 374]; *Каладзей* < рус. *колодей* 'калеснік', укр. *колодій* 'калеснік' [2, с. 170]; *Калеснікаў* < калеснік 'майстар, які вырабляе колы, калёсы' [4, с. 586]; *Канавалаў* < канавал 'лекар без спецыяльнай ветэрынарнай адукацыі, які займаецца лячэннем коней' [4, с. 609]; *Каплан* < рэг. 'капелан' [2, с. 180]; *Краўцоў, Краўчанка* < ад кравец [2, с. 216]; *Кухта* < рэг. уст. 'прыслужнік, вучань повара' [2, с. 236]; *Маскалёў, Маскаленчык, Маскальчук* < бел. маскаль 'падданы Маскоўскай дзяржавы', рэг. 'салдат' [2, с. 277]; *Мельнік, Мельнікаў* < рэг. 'мельнік на вадзяным млыне' [2, с. 283]; *Навічонак, Новік* < рэг. 'новы чалавек у сям'і, новы член сям'і' [2, с. 294]; *Найдзін* < рэг. 'знайдыш' [2, с. 296]; *Панамарэнка* < ад панамар 'псаломшчык' [2, с. 313]; *Повар* < 'кухар, спецыяліст па прыгатаванні ежы' [4, с. 284]; *Пруднікаў* < рэг. 'мельнік на вадзяным млыне' [2, с. 333]; *Прыходзька* < 'той, хто прыйшоў, прышлы' [2, с. 336]; *Пушкар, Пушкароў, Пушкарэвіч* < уст. 'артылерыст' [3, с. 528]; *Рыбак, Рыбакоў* < рэг. 'рыбак, рыбалоў' [3, с. 733]; *Старавойтаў* < старавойт 'начальнік гарадскога пасялення' [5, с. 501]; *Старчанка* < ад старац [2, с. 390]; *Стралец, Стральцоў* < 'стралок, рэг. паляўнічы' [2, с. 392]; *Сялюк* < укр. *селюк* 'вясковы чалавек, вясковец' [2, с. 404]; *Ткач, Ткачоў, Ткачык* < ткач 'рабочы, майстар, які вырабляе тканіну на ткацкім станку' [5, с. 490]; *Траццякоў* < 'трэці па ліку', 'трохгодак' [2, с. 413]; *Удовін* < ад удава [2, с. 420]; *Цагельнік* < 'рабочы, які працуе на цагельні' [6, с. 224]; *Цемнік* < рус. *темник* 'знайдыш, падкідыш' [2, с. 437]; *Шаўцоў, Шаўчэнка* < ад шавец [2, с. 460].

**Назвы жывёл, птушак, рыб і насякомых.** Гэта група з'яўляецца адной з важных крыніц для ўтварэння прозвішчаў Акцябрскага раёна: *Волкаў; Баранаў, Бараноўскі, Барашка; Быкаў, Бычкоўскі; Кабыльскі, Кабылянец; Казлоў, Казлоўскі; Лашкевіч; Лосеў, Лось; Львоў; Сяўрук* < цюрск. *севрюк* 'жарабец' [2, с. 405]; *Траццякоў* < траццяк 'конь трох гадоў' [7, с. 300]; *Бобрык* < бабёр [2, с. 28]; *Барсук, Барсукоў; Зайцаў; Куніцкі, Кунічык; Русак, Русаковіч, Русакоў* < бел. рус. 'заяц-русак' [2, с. 355]; *Трус; Вараб'ёў; Галка; Голуб, Голубеў; Гракаў; Гусакоў; Драздоў, Драздоўскі, Дрозд; Жураў* < жураў 'журавель' [2, с. 148]; *Кажан* < кажан 'лятучая мыш' [2, с. 167]; *Коршак* < каршун [4, с. 651]; *Крук, Крукоўскі* < рэг. *крук* 'воран' [2, с. 219]; *Кулік; Курач* < рэг. 'курыца, якая нясецца і мае выгляд пеўня' [2, с. 232]; *Лебедзеў, Лебедзь; Лушчык* < укр. *лущ* 'назва птушкі' [2, с. 259]; *Мазуркевіч* < мазурок 'палявы верабей' [2, с. 267]; *Петух, Пятух; Пугач, Пугачоў* < 'драпежная начная птушка атрада соў' [3, с. 515]; *Рабцэвіч, Рабчанка* < рус. *рябец* 'назва птушкі', укр. *робець* 'род коршуна' [2, с. 343]; *Сакалоў, Сокал, Сокалаў; Салавей, Салаўёў; Сініца; Сікорскі* < укр. *сикір, сикорка* 'сініца' [2, с. 373]; *Чайкоўскі; Чыж, Чыжоў, Чыжык; Шпак, Шпаковіч, Шпакоўскі; Шчур* < рус. *щур* '(птушка) стрыж' [2, с. 488]; *Шыкун, Шыкуноў* < рэг. 'парода дамашніх гусей' [2, с. 490]; *Юркевіч* < *юрок* 'птушка палявая' [7, с. 153]; *Акуліч* < акула [2, с. 19]; *Бялуга; Карась; Карпаў, Карпікаў, Карповіч; Сазонаў; Шаран, Шаранкоў, Шаранок* < шаран рус. 'рыба карп, сазан, калі важыць менш як 10 фунтаў' [2, с. 467–468 ]; *Яршоў*; *Камароўскі, Комар* < рус. 'камарык, мошка, казюлька' [2, с. 176]; *Клешчанка; Муравейка; Прус* < 'рыжы таракан' [3, с. 402].

**Назвы асоб па адносінах сваяцтва ці становішча ў сям'і:** *Бабенка; Бабіч, Бабічэнка* < рэг. 'дзіця, якое нарадзілася ў бабкі-павітухі ці ў старой жанчыны', рус. 'бабнік' [2, с. 29]; *Бальшакоў* < бальшак 'старшы сын у сям'і', рус. *большак* 'старшы ў сям'і', 'галоўны распарадчык у сям'і' [2, с. 39]; *Ждановіч (Здановіч)* < ад *ждан* 'той, якога чакалі' [2, с. 146]; *Кучынскі* < тур. *кучук* 'дзіця' [2, с. 237]; *Малец* < рус. *малик* 'дзіця, малыш', 'меншы ў сям'і' [2, с. 271]; *Малуха* < рус. 'дзіця, малыш', 'меншы ў сям'і' [2, с. 271]; *Малышка* < ад малыш [2, с. 272]; *Мальцаў* < рэг. 'хлопец, падростак' [2, с. 271]; *Маханька, Маханько* < ад махонь [2, с. 280]; *Новік* < рэг. 'новы чалавек у сям'і', 'новы член сям'і'

[2, с. 294]; *Пазняк* < рус. *поздняк* ‘апошняе дзіця ў старых бацькоў ці дзіця, якое нарадзілася праз доўгі час пасля папярэдняга’ [2, с. 308]; *Прыкота* < ад прыкаціцца ‘новы чалавек з іншай мясцовасці ці прымак’ [2, с. 334]; *Прымак* < прымак ‘муж, якога прынялі ў сям’ю жонкі, які жыве ў доме жонкі’ [3, с. 448]; *Прыходзька* < ‘той, хто прыйшоў, прышлы’ [2, с. 336]; *Старухін, Старык, Старыкаў; Сысоеў, Сысун* < ‘дзіця млекакормячай жывёліны, якое ля маці’, разм. жарт. ‘маленькае дзіця; немаўля’ [5, с. 435]; *Трацяк, Трацякоў* < укр. *трацяк* ‘трэці па ліку’ [2, с. 413]; *Траян, Траянок* < укр. *троян* ‘бацька траіх блізнят’ [2, с. 413]; *Удовін, Удовенка* < ад удава [2, с. 420]; *Харлан* < укр. *харлань* ‘бядняк, жабрак, абарванец’ [2, с. 427]; *Чэкан* < ад чакаць г. зн. ‘той, якога чакалі, хацелі, каб нарадзіўся’ [2, с. 445]; *Чэчыкаў* < рус. *чеча, чечя* ‘песта, распешчанае дзіця’ [2, с. 458]; *Шастак, Шастакоў* < рэг. *шастак* ‘шостае па ліку дзіця ў сям’і’ [2, с. 469].

Такім чынам, аналіз вышэй разгледжаных прозвішчаў дае нам магчымасць сцвярджаць, што самай прадуктыўнай матывацыйнай базай для ўтварэння прозвішчаў Акцябрскага раёна з’яўляецца апелятыўная лексіка, якая прадстаўлена разнастайнымі лексіка-семантычнымі групамі. Найбольш вялікі пласт складаюць прозвішчы, якія адлюстроўваюць фізічныя і разумовыя якасці чалавека. Даволі пашыранымі з’уляюцца прозвішчы, якія ўтварыліся ад назваў прафесій і розных відаў дзейнасці людзей, назваў жывёльнага і расліннага свету. Радзей сутракаюцца прозвішчы суадносныя з назвамі асоб па адносінах сваяцтва і сямейных адносінах.

## Літаратура

1. Суперанская, А. В. Современные русские фамилии / А. В. Суперанская, А. В. Суслова ; под ред. Ф. П. Филина. – М. : Наука, 1981. – 176 с.

2. Бірыла, М. В. Беларуская антрапанімія 2 : Прозвішчы, утвораныя ад апелятыўнай лексікі / М. В. Бірыла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 508 с.

3. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / АН БССР, Інс-т мовазнаўства ім. Я. Коласа. – Мінск, 1978. – Т. 2 : Г–К. – 768 с.

4. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / Інс-т мовазнаўства ім. Я. Коласа. – Мінск, 1980. – Т. 4 : П–Р. – 768 с.

5. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / Інс-т мовазнаўства ім. Я. Коласа. – Мінск, 1982. – Т. 5, ч. 1 : С–У. – 663 с.

6. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / Інс-т мовазнаўства ім. Я. Коласа. – Мінск, 1984. – Т. 5, ч. 2 : У–Я. – 608 с.

7. Беларуская мова : міжведамасны зборнік / М-ва выш. і сярэд. спец. адукацыі БССР, Гомельскі дзярж. ун-т ; рэдкал.: У. В. Анічэнка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Выдавецтва БДУ імя У.І. Леніна, 1980. – Вып. VIII. – 168 с.

Гомельский государственный технический
университет имени П.О. Сухого

Поступила в редакцию 09.01.2025